Дзяніс ЛІСЕЙЧЫКАЎ

# "З Напалеонам Бог, а Напалеон з намі!"*: папулярнасць імя французскага імператара на землях былога Вялікага Княства Літоўскага ў XIX стагоддзі

*15 жніўня 2019 г. спаўняецца 250 гадоў з дня нараджэння Напалеона Банапарта — чалавека, які пакінуў велізарны след у сусветнай гісторыі. У XIX ст. асоба французскага імператара была надзвычай папулярнай і на землях былой Рэчы Паспалітай. З дапамогай Напалеона частка жыхароў беларускіх і літоўскіх зямель спадзявалася адрадзіць нядаўна зніклую дзяржаву — Вялікае Княства Літоўскае. У час кампаніі 1812 г. легендарны карсіканец асабіста камандаваў узяццем Вільні, Глыбокага, Віцебска, ён стаў героем многіх мясцовых легенд. У дадзеным артыкуле мы паспрабуем разгледзець незвычайны бок напалеонаманіі на нашых землях — традыцыю надання імя* **Напалеон** *народжаным дзецям.*

Частка шляхецкіх колаў былой Рэчы Паспалітай на працягу ўсяго XIX ст. не траціла надзеі на адраджэнне сваёй былой дзяржавы. Найбольш яскравымі праявамі гэтых настрояў, безумоўна, былі маштабныя паўстанні 1830—1831 і 1863—1864 гг. Праекты ўзнаўлення Вялікага Княства Літоўскага датрывалі нават да часоў Першай сусветнай вайны 1914—1918 гг.[1]. Многія прадстаўнікі мясцовых эліт балюча перажывалі страту ўласнай дзяржаўнасці і намагаліся выкарыстаць любыя спрыяльныя ўмовы, каб яе аднавіць. Іх позіркі ўсё часцей скіроўваліся ў бок Францыі. Менавіта гэтая краіна, як лічылася, была здольная "адпомсціць" усім тром удзельнікам падзелаў Рэчы Паспалітай — Расіі, Прусіі і Аўстрыі. Францыя, варта прызнаць, нямала рабіла, каб заваяваць сэрцы польскай, беларускай і літоўскай шляхты. Стварэнне ў складзе італьянскай арміі пад французскім камандаваннем польскіх легіёнаў у канцы 1790-х гг., разгром Прусіі і з'яўленне ў 1807 г. на палітычнай карце Еўропы невялікай польскай дзяржавы — Варшаўскага Герцагства, разгром Аўстрыйскай Імперыі і ўключэнне ў склад Герцагства ў 1809 г. земляў былой Рэчы Паспалітай, што адышлі да Аўстрыі паводле падзелаў Рэчы Паспалітай, заклалі пачатак вялікай папулярнасці сярод жыхароў былой Рэчы Паспалітай французскага імператара Напалеона Банапарта. Самі за сябе гавораць радкі т. зв. "*Мазуркі Дамброўскага*", напісанай у 1797 г. Ю.Выбіцкім, якая была надзвычай папу-

* Урывак з паэмы Адама Міцкевіча "Пан Тадэвуш, альбо Апошні наезд у Літве" (упершыню апублікаванай у 1834 г.): *"Дзе бітва? У якім баку" — хлапцы пытаюць / І зброю рвуць, жанчыны рукі ўзнімаюць / Усе ў перамогу вераць, са слязамі / Крычаць: "З Напалеонам Бог, а Напалеон з намі!"* (Пераклад з польскай Я.Семяжона.)



***ЛІСЕЙЧЫКАЎ Дзяніс Васільевіч.***

*Намеснік дырэктара Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі, кандыдат гістарычных навук. Нарадзіўся ў 1979 г. у в. Дзяніскавічы Ганцавіцкага раёна Брэсцкай вобласці. У 2001 г. скончыў гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, у 2002 г. — магістратуру пры названым факультэце, у 2006 г. — аспірантуру Інстытута гісторыі НАН Беларусі. У 2009 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю на тэму "Штодзённае жыццё ўніяцкага парафіяльнага святарства беларуска-літоўскіх зямель (1720—1839 гг.)". Аўтар манаграфій "Штодзённае жыццё ўніяцкага парафіяльнага святара беларуска-літоўскіх зямель 1720—1839 гг." (Мн., 2011), "Святар у беларускім соцыуме: прасапаграфія ўніяцкага духавенства 1596—1839 гг." (Мн., 2015) і больш за 50 іншых навуковых публікацый, у тым ліку калектыўных манаграфій і зборнікаў дакументаў. Лаўрэат прэміі III Міжнароднага кангрэса даследчыкаў Беларусі (г. Каўнас, Літва, 2013 г.) за найлепшую манаграфію ў намінацыі "Гісторыя" і літаратурнай прэміі імя Ф.Багушэвіча (2016) за лепшую гістарычную прозу.*



pawet.net

лярнай сярод насельніцтва былой Рэчы Паспалітай, а ў XX ст. нават стала нацыянальным гімнам Польшчы:

"*Przejdziem Wisłę, przejdziem Wartę,*
*Będziem Polakami.*
*Dał nam przykład Bonaparte,*
*Jak zwyciężać mamy*"*.

У польскамоўнай літаратуры XIX ст. атрымаў шырокае распаўсюджанне гераічны "напалеонаўскі міф", які дасягнуў асаблівых маштабаў пасля паражэння паўстання 1830—1831 гг.[2]. Самым вядомым прыкладам з'яўляецца найбольш значны твор Адама Міцкевіча "Пан Тадэвуш", напісаны паэтам у эміграцыі ў Парыжы ў 1832—1834 гг. Найбольшая колькасць эмігрантаў з т. зв. "беларуска-літоўскіх" губерняў, якія пакінулі Радзіму ў выніку паразы паўстання 1830—1831 гг., асела менавіта ў Францыі[3]. Вялікія надзеі ўскладала шляхта земляў былога ВКЛ на поспехі французаў у Крымскай вайне супраць Расійскай Імперыі ў 1853—1856 гг., а ў часе паўстання 1863—1864 гг. немалы разлік рабіўся на дыпламатычную і нават вайсковую дапамогу Францыі. Не будзем забываць і тое, што з 1848 па 1870 г. Францыяй кіраваў яшчэ адзін Напалеон — пляменнік Напалеона I, Напалеон III.

У нашым даследаванні мы прааналізавалі дынаміку роста прафранцузскіх настрояў у грамадстве зямель былога ВКЛ з дапамогай незвычайнага метадалагічнага інструментарыю. "Напалеонаманія" на землях былога ВКЛ мела адну вельмі цікавую праяву — наданне імя французскага імператара народжаным дзецям. Гэтая традыцыя з'яўляецца лёгкавызначальным маркерам, які да таго ж даволі добра паддаецца колькаснаму аналізу. Інтэнсіўнасць надання гэтага імя ў залежнасці ад рэгіёна і часу як лакмусавая паперка дае магчымасць зафіксаваць і ацаніць наяўнасць умоўных "антырасійскіх" і "незалежніцкіх" настрояў, з якімі была цесна звязаная ўся напалеонаманія ў грамадстве былога ВКЛ у XIX ст.

Ідэя праводзіць даследаванні папулярнасці таго ці іншага імя не новая**. Больш за тое, прадстаўнічы інтэрнэт-партал "*Geneanet*" ужо зараз дае магчымасць ствараць цудоўную інфаграфіку распаўсюджання імя *Напалеон* (зрэшты як і ўсіх астатніх) па цэлым свеце[4]. Найбольшая колькасць носьбітаў, якая вымяраецца дзясяткамі і нават сотнямі тысяч чалавек, выпадае, што натуральна, на рэгіёны Францыі і Паўночнай Італіі, франкамоўныя тэрыторыі Канады. Даволі шмат носьбітаў гэтага імя лакалізуецца і на астравах Рэюньён і Маўрыкій каля Мадагаскара. Партал дае магчымасць адлюстраваць папулярнасць імя і паводле шкалы часу — ад 1769 г. (нараджэнне Напалеона Банапарта) да 1970-х гг. Недахоп дадзенага рэсурсу палягае ў тым, што для сваіх падлікаў ён выкарыстоўвае толькі тыя крыніцы генеалагічнага характару, якія даступныя онлайн і маюць распрацаваныя тэкставыя паказальнікі. З гэтай прычыны на ім практычна адсутнічаюць дадзеныя па тэрыторыях былой Рэчы Паспалітай, асабліва сённяшніх Літвы і Беларусі, і ў зусім невялікім аб'ёме прадстаўлены землі сённяшняй Польшчы. Наша даследаванне заклікана закрыць гэтую лакуну.

### Першыя ластаўкі: *Напалеоны* 1805—1815 гг.

19 лютага 1806 г. Напалеон выдаў дэкрэт, у якім абвяшчалася аб штогадовым святкаванні 15 жніўня дня святога Напалеона[5]. Хоць сама падзея па сутнасці з'яўлялася ні чым іншым, як "*вынаходніцтвам традыцыі*", само свята стала дзяржаўным не толькі ў Францыі, але і ў Варшаўскім Герцагстве, а ў 1812 г. і на землях былога ВКЛ[6]. У сувязі з гэтым можа падацца, што на землях былога ВКЛ звязваць выбар імя *Напалеон* для дзяцей з сімпатыямі да французскага імператара няма падстаў. Калі з'явілася свята, то з'явіліся і першыя ахрышчаныя такім імем. Аднак у рэальнасці ўсё выглядае іначай.

Першыя Напалеоны на землях былой Рэчы Паспалітай пачалі з'яўляцца раней за люты 1806 г. Можна прыгадаць, напрыклад, вядомага польскага кнігавыдаўца Напалеона Каменскага, які нарадзіўся 14 студзеня 1806 г. у Познані[7]. Менавіта ў гэтым горадзе ў лістападзе 1806 г. пачалося Вялікапольскае паўстанне, якое прывяло да ўзнікнення Варшаўскага Герцагства.

На землях былога ВКЛ, як паказала наша даследаванне, хрысціць немаўлят імем *Напалеон* пачалі яшчэ раней. Разумеючы немагчымасць прагляду захаваных метрычных кніг усіх касцёлаў на тэрыторыі былога ВКЛ пачатку XIX ст., мы прынялі рашэнне правесці кантрольнае даследаванне ў наступных аб'ёмах. Для апрацоўкі і аналізу былі абраныя найлепш захаваныя метрычныя кнігі 1800—1815 гг. самых значных касцёлаў з разлеглымі парафіямі і вялікай штогадовай колькасцю ахрышчаных па самых розных рэгіёнах былога ВКЛ: Бабруйск, Барысаў, Вільня, Мінск, Навагрудак, Пінск і Рэчыца. У якасці дапаможнай крыніцы былі выкарыстаны біяграфічныя звесткі пра ўсіх носьбітаў імя *Напалеон* са шматтомнага выдання Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі "Гербоўнік беларускай шляхты"[8]. Вынікі атрымаліся наступнымі.

Самы ранні з выяўленых намі выпадкаў хрышчэння немаўляці імем *Напалеон* на землях былога ВКЛ быў зафіксаваны 26 сакавіка 1805 г. у Навагрудскім фарным касцёле[9]. Немаўля нарадзілася ў

* Даслоўны пераклад: "*Пяройдзем Віслу, пяройдзем Варту, / будзем палякамі! / Банапарт даў нам прыклад, / як нам трэба перамагаць*".

** Першую апрабацыю дадзенай методыкі аўтар гэтых радкоў правёў у мінулым годзе, падрыхтаваўшы артыкул аб папулярнасці імя *Іасафат* на беларуска-літоўскіх землях у XVII—XVIII стст. Выхад артыкула запланаваны на 2020 г.

сям'і гарадскога галавы Навагрудка Станіслава Камінскага і яго жонкі Анэлі Сідарэвіч. Ахрысціў хлопчыка, які нарадзіўся 12 сакавіка таго ж года, манахдамініканін Гіяцынт Скіндэр. Нагадаем, што ў тым жа самым касцёле ў 1798 г. быў ахрышчаны Адам Міцкевіч, які актыўна папулярызаваў гераічны "напалеонаўскі міф" і цытата з чыйго твору вынесена ў загаловак гэтага артыкула. Як бачым, напалеонаманія ў Навагрудку мела трывалыя карані яшчэ ў дзіцячыя гады будучага паэта.

Адной з першых асоб на нашых землях, ахрышчаных імем *Напалеон*, мог бы стаць і шляхціч Андрэй-Напалеон Грыневіч, якога нібыта ахрысцілі ў Лагішынскім касцёле Пінскага павета 14 ліпеня 1805 г.[10]. Аднак азнаямленне з радаводнай справай роду Грыневічаў, дзе маецца датаваная 1832 г. копія метрычнага запісу аб хрышчэнні названага чалавека[11], паказала, што гэта фальсіфікат. Арыгіналы метрычных кніг Лагішынскага касцёла за патрэбны год захаваліся фрагментарна, і асобы з такім імем там не зафіксавана[12]. Цікава, што імя ў сфальсіфікаваным дакуменце запісана праз літару "і" — *Napolion*. У такім жа варыянце пінскі "*Напаліон*" запісаны і ў рэвізскай сказцы 1816 г.[13], праўда, ужо з пазначэннем, што нарадзіўся ён у 1807 г.

26 лістапада 1806 г. у Серафінскім касцёле Ігуменскага павета Мінскай губерні ксёндз Адрыян Ляданоўскі ахрысціў імем Напалеон-Францішак-Ксаверый сына шляхціча Антона Гурскага і яго жонкі Ганны Татур з ваколіцы Суцін[14].

У сталіцы былога ВКЛ, Вільні, першае хрышчэнне дзіцяці ў гонар Напалеона адбылося 31 сакавіка 1807 г., калі была ахрышчана народжаная 27 сакавіка дачка шляхціча Мацея Паўлоўскага і яго жонкі Барбары Нарбут Марыяна-Напалеона-Амелія[15]. У праяўленні сваіх сімпатый да Францыі і яе імператара сталіца былога ВКЛ адзначылася яшчэ і тым, што метрычныя кнігі мясцовых касцёлаў пад уздзеяннем урачыстасцяў з нагоды дня нараджэння Напалеона ў жніўні 1812 г. былі пераведзеныя на грыгарыянскі каляндар[16]. Адзначым, што юліянскі каляндар вярнулі ў снежні, пасля адступлення французскіх войск з горада[17].

Сярод першых ахрышчаных у гонар французскага імператара на беларускіх землях нельга не ўзгадаць знакамітага мастака і музыканта Напалеона Орду, які нарадзіўся 11 лютага 1807 г. у родавым маёнтку Варацэвічы Кобрынскага павета Гродзенскай губерні. Пасля Банапарта гэта, бадай, самы вядомы Напалеон у гісторыі зямель былога ВКЛ.

Яскравым прыкладам, які паказвае прамую сувязь паміж папулярнасцю імя Напалеон і антырасійскімі настроямі, з'яўляюцца метрычныя кнігі кафедральнага касцёла ў Мінску. На адцінку 1800—1815 гг. гэтае імя зафіксавана тут тройчы, і ўсе разы ў 1812 г. — 27 красавіка (9 мая па новым стылі), 1 (13) ліпеня і 24 ліпеня (5 жніўня)[18]. Калі накласці даты гэтых трох хрышчэнняў на падзеі грамадска-палітычнага жыцця земляў былога ВКЛ, вымалюецца наступная карціна. 27 красавіка ў чаканні непазбежнай вайны паміж Францыяй і Расіяй гэта яшчэ было "асцярожнае" дадатковае імя ў складзе падвойнага — Аляксандр-Напалеон. 1 (13) ліпеня, у першыя дні пасля ўваходу ў Мінск французскіх войскаў, гэта было досыць выразнае, хоць і ў жаночым варыянце, асноўнае імя ў складзе патройнага — Напалеона-Вікторыя-Юзэфа. 24 ліпеня (5 жніўня), праз месяц пасля заняцця французскімі войскамі маршала Л.Даву Мінска, гэта было ўжо ўпэўненае асноўнае і адзінае мужчынскае імя — Напалеон. Дарэчы, у выпадку з Напалеонай-Вікторыяй-Юзэфай, якая нарадзілася ў першыя дні пасля ўваходу французскіх войскаў у Мінск, магла мець месца яшчэ больш складаная матывацыя выбару. Магчыма, у дадатковыя імёны Вікторыі і Юзэфы ўкладалася пажаданне далейшай перамогі (лацінск. — *victoria*) войскам пад кіраўніцтвам князя Юзафа Панятоўскага, ваеннага міністра Варшаўскага Герцагства і фактычнага кіраўніка прафранцузскай партыі сярод шляхецкіх колаў былой Рэчы Паспалітай*.

Усе ахрышчаныя імем французскага імператара ў Мінску ў 1812 г. былі дзецьмі мясцовай шляхты. Хрышчэнне адбывалася ў галоўным храме Мінскай епархіі, кафедральным саборы. Менавіта тут 19 ліпеня 1812 г. мінскі рымска-каталіцкі епіскап Якуб Дэдэрка адслужыў урачыстую вайсковую імшу, пасля якой у сваёй прамове сказаў наступнае: "*Ужо скрушаны кайданы маскоўскія, трапілі мы пад салодкае панаванне вялікага цэзара Напалеона", — а затым заклікаў усіх сыноў Айчыны лучыцца пад харугвамі збавіцеля*"[19]. Пасля паражэння і пазнейшага адыходу французскіх войскаў хрышчэнні імем Напалеон у метрычных кнігах Мінскага кафедральнага касцёла не фіксаваліся.

Цікавасць уяўляюць і дадзеныя метрычных кніг францішканскага касцёла ў Пінску — самай вялікай рымска-каталіцкай парафіі беларускага Палесся. Дадзеныя атрымаліся наступнымі: з 1800 па 1811, і з 1813 па 1815 гг. тут не было ахрышчана ніводнага дзіцяці з імем *Напалеон*. Адзіны хрост падвойным імем Напалеон-Францішак у Пінску зафіксаваны толькі 10 лістапада 1812 г.[20]. Гэта быў час, калі французскія войскі адступалі ў кірунку знакамітай Бярэзіны.

Трэба адзначыць, што наданне імя ў гонар французскага імператара на землях былога ВКЛ — з'ява, характэрная не толькі для рымска-каталіцкага насельніцтва краю. Вядома, што Сінод праваслаўнай царквы Расійскай Імперыі 13 (25) снежня 1806 г. абвясціў анафему французскаму імператару[21], якая была паўтораная ў ліпені 1812 г. Зразумела, у праваслаўных цэрквах і без таго не маглі хрысціць дзя-

* Выказваю падзяку ВадзімуАдадураву за зварот увагі на магчымую матывацыю выбару імя ў гэтым выпадку.

цей імем каталіцкага святога, няхай і сумнеўнага паходжання. Аднак варта не забываць, што на землях былога ВКЛ да канца 1830-х гг. існавала яшчэ адна, колькасна значна большая за праваслаўную, царква ўсходняга абраду — уніяцкая (грэка-каталіцкая). Як жа паступалі ў пачатку XIX ст. з імем *Напалеон* нашы ўніяты? На гэтае пытанне таксама ёсць адказ.

Некалькі гадоў мы збіралі біяграфічныя звесткі аб уніяцкім духавенстве былога ВКЛ 1596—1839 гг., што дало магчымасць стварыць даволі прадстаўнічую выбарку асоб духоўнага паходжання, народжаных у 1800—1830-х гг., агулам — каля 3500 чалавек[22]. Сярод іх маюцца чатыры носьбіты імя Напалеон[23]. З'ява гэтая, як бачым, была не надта распаўсюджанай сярод уніяцкага духавенства, хоць і не выключна рэдкай. Самы ранні факт хрышчэння хлопчыка імем *Напалеон* ва ўніяцкай царкве на землях былога ВКЛ адбыўся ў правінцыйным сельскім храме вёскі Свяда Барысаўскага павета (сёння в. Слабада Лепельскага раёна Віцебскай вобласці) 20 красавіка 1806 г.[24]. Тут таксама меў месца свядомы выбар імя бацькамі. Дзіця нарадзілася ў сям'і не звычайных парафіян, а ў будучага святара гэтай жа царквы Юстына Хруцкага. Хрышчэнне здзейсніў бацька Юстына і адпаведна дзядуля маленькага Напалеона Ян Хруцкі.

Хлопчыка з імем Напалеон, які нарадзіўся на тэрыторыі парафіі Навагрудскага фарнага касцёла, 28 студзеня 1808 г. хрысціў святар бліжэйшай уніяцкай царквы з вёскі Акаловічы Тэадор Гарбацэвіч[25]. Хлопчык нарадзіўся 18 студзеня ў шляхецкай сям'і Ігната і Ганараты Аколавых. Адама-Напалеона Грудзінскага, сына шляхціча з ваколіц Рэчыцы, 4 студзеня 1811 г. хрысціў у мясцовым касцёле ўніяцкі святар Тамаш Чачот[26].

Невялікая колькасць ахрышчаных імем *Напалеон* у метрычных кнігах уніяцкіх цэркваў, магчыма, тлумачыцца тым, што на ранніх этапах наданне імя ў гонар французскага імператара было модным пераважна ў шляхецкім асяроддзі. А асноўную масу ўніятаў (грэка-каталікоў) на тэрыторыі т. зв. беларуска-літоўскіх губерняў Расійскай Імперыі ў першай трэці XIX ст. складалі, як вядома, сяляне.

Пры супастаўленні біяграфічных дадзеных асоб, пра якіх было дакладна вядома, што яны насілі імя Напалеон у сталым узросце, з дадзенымі метрычных кніг, выявілася яшчэ адна акалічнасць. Верагодна, некаторыя з тых, хто быў народжаны ў 1805—1812 гг., бралі сабе імя *Напалеон* у якасці другога імя, што называецца, постфактум. Гэта магло адбыцца, напрыклад, пры пазнейшым мірапамазанні (канфірмацыі). Так, дакладна невядома, калі пачаў насіць імя французскага імператара ўдзельнік паўстання 1830—1831 гг. Міхал-Напалеон Хадаровіч[27], які быў ахрышчаны ў Навагрудскім фарным касцёле 5 лістапада 1805 г. У метрычных кнігах гэтага касцёла ён запісаны толькі пад імем Міхал[28].

Увогуле ж у ходзе нашага даследавання былі апрацаваныя метрычныя кнігі аб ахрышчаных за 1800—1815 гг. Бабруйскага фарнага, Барысаўскага фарнага, Віленскага Святых Янаў, Мінскага кафедральнага, Навагрудскага фарнага, Пінскага францішканскага, Рэчыцкага фарнага касцёлаў. Сярэднегадавая колькасць запісаў аб хрышчэннях па ўсіх касцёлах — каля 700. Дзяцей, ахрышчаных імем Напалеон у гэты перыяд, выявіліся адзінкі. Дадзеныя склаліся ў наступную карціну *(гл. дыяграму)*.




Як бачым, імя пачало набываць папулярнасць на землях былога ВКЛ пасля каранацыі Напалеона Банапарта ў 1804 г. Яно стала больш распаўсюджаным пасля заключэння Тыльзіцкага міру ў 1807 г. і асабліва — у час вайны 1812 г. На Напалеона ўскладаліся вялікія надзеі па адраджэнні былога ВКЛ. Пасля разгрому і адступлення французскіх войскаў у снежні 1812 г. называць дзяцей у гонар французскага імператара стала небяспечна, і папулярнасць імя рэзка скарацілася.

Як паказваюць біяграфічныя дадзеныя тысяч прадстаўнікоў шляхецкага саслоўя, сабраныя і сістэматызаваныя ў шматтомным выданні "Гербоўнік беларускай шляхты"[29], новая хваля папулярнасці імя Напалеон пачалася пасля задушэння паўстання 1830—1831 гг. Па-сутнасці, гэта быў адзін з нешматлікіх легальных спосабаў выказвання патрыятычных і антырасійскіх настрояў. Менавіта на гэты перыяд прыпадае і росквіт літаратуры рамантызму з вялікай колькасцю твораў, прысвечаных гераізацыі гістарычных падзей, звязаных з імем Напалеона.

### Дзеці Тыльзіцкага міру: *Напалеоны-Аляксандры*

Цікавай праявай традыцыі надання імя ў гонар французскага імператара, характэрнай для падданых Расійскай Імперыі, было выкарыстанне падвойнага імя ў гонар адразу двух імператараў — і французскага, і расійскага. Варыянт быў даволі распаўсюджаным, а сярод падвойных і патройных імёнаў са складовай часткай *Напалеон* быў, бадай, самым



*Медальён з выявай Напалеона і Аляксандра.*

папулярным. Такім чынам як бы падкрэслівалася лаяльнасць да Расіі і забяспечвалася пэўная страхоўка ад падазрэнняў у магчымай нядобранадзейнасці. Зрэшты, пасля таго як 13 (25) ліпеня 1807 г. у прускім горадзе Тыльзіце быў заключаны мір, які юрыдычна зрабіў Расію саюзніцай Францыі, такая форма імя стала цалкам "трэндавай" і рэспектабельнай, прынамсі да пачатку кампаніі 1812 г.

Адным з першых "*дзяцей Тыльзіцкага міру*" на нашых землях быў сын віленскага шляхціча Напалеон-Аляксандр Смольскі, які нарадзіўся 28 лістапада 1807 г.[30]. Тое, што абранне "*былым капітанам польскіх войскаў*" Янам Смольскім і яго жонкай Тэкляй Пачобут для свайго сына імя французскага і расійскага імператараў мела, кажучы сучаснай мовай, выразны месэдж, паказвае выбар даты хрышчэння. Урачысты хрост свайго немаўляці бацькі адкладалі некалькі месяцаў і здзейснілі яго ў віленскім касцёле Святых Янаў 3 мая 1808 г. Ці варта нагадваць, якое значэнне для земляў былой Рэчы Паспалітай мела забароненае ў Расійскай Імперыі свята Канстытуцыі 3 мая 1791 г.?! Па-сутнасці, віленчукі Смольскія вынайшлі прыхаваную форму палітычнай маніфестацыі — нельга ж забараніць бацькам, хросным і сябрам сям’і шырока адсвяткаваць 3 мая радасную падзею — хрышчэнне сына, *Напалеона-Аляксандра*, імя якога сімвалізавала сяброўства Францыі і Расіі!

Напалеоны-Аляксандры нараджаліся ў Вільні і ў наступныя гады: 1810, 1811 і 1812[31]. Хлопчык з імем Аляксандр-Напалеон у 1812 г. таксама быў ахрышчаны і ў Мінску[32]. Увогуле "*дзеці Тыльзіцкага міру*" ў 1807—1812 гг. сталі распаўсюджанай з’явай на землях усяго былога ВКЛ. Многія з іх у пазнейшыя часы ў афіцыйных дакументах прыбіралі са свайго імя небяспечны дадатак і рабіліся толькі Аляксандрамі, як гэта ў 1834 г. зрабіў Напалеон-Аляксандр Заліўскі[33]. Аднак былі і адваротныя выпадкі. Напрыклад, будучы маршалак шляхты Мазырскага павета Аляксандр-Напалеон Замайскі, якога ахрысцілі ў касцёле мястэчка Лахва Мазырскага павета 8 чэрвеня 1811 г.[34], у афіцыйным дакуменце аб дваранскім паходжанні (выводзе) 1817 г. быў запісаны сваім бацькам толькі як Напалеон[35]. З усёй верагоднасцю гэта таксама быў свядомы выбар — карыстацца імем нядаўна зрынутага французскага імператара ў гэты час было фактычнай дэманстрацыяй сваіх палітычных перакананняў. Гэтыя ўмоўныя незалежніцкія і антырасійскія настроі свайго бацькі ўскосна пацвердзіў і сам Аляксандр-Напалеон Замайскі, калі 17 красавіка 1849 г. ахрысціў свайго сына імем Францішак-Напалеон[36].

Апошні выпадак выявіў яшчэ адну цікавую акалічнасць факта надання народжанаму дзіцяці імя *Напалеон*, які можна ахарактарызаваць як фактар родавага імя. У наступных пакаленнях сем’яў, якія аднойчы абіралі для сваіх дзяцей імя Напалеон, надзвычай часта з’яўляліся і новыя Напалеоны. У гэтым плане цікавы прыклад шляхецкага роду Абуховічаў гербу "Ключ зменены" з Мазырскага і Слуцкага паветаў. "Напалеонаманія" найбольш яскрава праявілася ў 7-м і 8-м пакаленнях роду — імя знакамітага карсіканца насілі дзядзька (1840 года нараджэння) і два ягоныя пляменнікі (1868 і 1870 гадоў нараджэння)[37]. У дакументах удзельнікаў Першай сусветнай вайны 1914—1918 гг. сярод ураджэнцаў Віленскай губерні таксама маюцца звесткі аб цікавым персанажы — Напалеоне Напалеонавічы Чытовічы (Чатовічы)[38].

### *Напалеоны* ў Расійскай імперыі ў другой палове XIX ст.

Яшчэ адзін цікавы вынік нашага даследавання мы атрымалі пры спробе вылучыць рэгіёны па ўсёй Расійскай Імперыі ў другой палове XIX ст., дзе імя *Напалеон* атрымала хоць нейкае распаўсюджанне. Нам удалося вылучыць губерні і паветы, у якіх было зафіксавана гэтае імя, вызначыць інтэнсіўнасць яго надання, верагоднае паходжанне, а па магчымасці і ўмоўную "народнасць" яго носьбітаў. Як падаецца, у нас атрымалася знайсці метадалагічны і крыніцазнаўчы ключ для вырашэння і гэтай, здавалася б, цяжкарэалізуемай задачы. Адносна нядаўна ў інтэрнэце з’явілася прадстаўнічая база дадзеных салдат і афіцэраў арміі Расійскай Імперыі, якія ўдзельнічалі ў Першай сусветнай вайне[39]. Яна ўтрымлівае дадзеныя на дзясяткі тысяч персаналій з усіх рэгіёнаў імперыі ад Варшавы да Сахаліна. Мы задалі пошук на ўсіх носьбітаў імя *Напалеон* і імя па бацьку *Напалеонавіч*. Гады нараджэння ва ўсіх носьбітаў імя *Напалеон* атрымаліся ад 1870-х да 1890-х, у *Напалеонавічаў* бацькі нарадзіліся, верагодна, ад 1830-х да 1860-х. Такім чынам, базай ахоплена больш за дзве трацiны XIX ст. Вынікі атрымаліся наступныя.

Сярод удзельнікаў Першай сусветнай вайны ў арміі Расійскай Імперыі значыцца 235 *Напалеонаў* альбо

*Напалеонавічаў*. Не ва ўсіх у іх пазначана месца нараджэння (губерня і павет), веравызнанне, саслоўе і народнасць. Тыя персаналіі, у каго гэтыя графы запоўненыя, тэрытарыяльна прадстаўлены наступным чынам *(гл. табліцу 1)*:

**Табліца 1.** Губерні і вобласці Расійскай Імперыі, адкуль паходзілі носьбіты імя Напалеон і імя па бацьку Напалеонавіч. Дадзеныя на 1914—1918 гг.

| Губерня альбо вобласць | Колькасць носьбітаў |
|---|---|
| Ковенская | 61 |
| Віленская | 38 |
| Мінская | 19 |
| Віцебская | 13 |
| Варшаўская | 8 |
| Ломжынская | 5 |
| Валынская | 4 |
| Петракоўская | 4 |
| Гродзенская | 3 |
| Кутаіская | 3 |
| Магілёўская | 3 |
| Эрыванская | 3 |
| Елізаветпольская | 2 |
| Калішская | 2 |
| Сувалкаўская | 2 |
| Тыфліская | 2 |
| Акмалінская | 1 |
| Екацярынаслаўская | 1 |
| Казанская | 1 |
| Калужская | 1 |
| Кастрамская | 1 |
| Кельцаўская | 1 |
| Курляндская | 1 |
| Ліфляндская | 1 |
| Люблінская | 1 |
| Маскоўская | 1 |
| Падольская | 1 |
| Сахалінская | 1 |
| Томская | 1 |
| Церская | 1 |
| **УСЯГО:** | 186 |

Паводле атрыманых вынікаў можна вылучыць тры буйныя рэгіёны, дзе імя *Напалеон* атрымала найбольшае распаўсюджанне. Гэта тэрыторыя былога ВКЛ, вядомая ў другой палове XIX ст. у Расійскай Імперыі як т. зв. Паўночна-Заходні край (Віленская, Віцебская, Гродзенская, Ковенская, Магілёўская і Мінскія губерні), — агулам 137 носьбітаў, т. зв. ***Царства Польскае*** (Варшаўская, Калішская, Кельцаўская, Ломжынская, Люблінская, Петракоўская і Сувалкаўская губерні) — агулам 23 носьбіты, і ***Каўказскае намесніцтва*** (Елізаветпольская, Кутаіская, Тыфліская, Эрыванская губерні і Церская вобласць) — агулам 11 носьбітаў. Усе астатнія рэгіёны, за выключэннем Валынскай губерні (4 носьбіты), маюць па 1 прадстаўніку з імем *Напалеон* (усяго 11 губерняў).

**Каўказскі след**. Найбольш цікавай, на першы погляд, тэрыторыяй з папулярнасцю імя *Напалеон* з'яўляецца Каўказскае намесніцтва. Паспрабуем разабрацца з прычынамі гэтай папулярнасці менавіта тут.

З 11 носьбітаў на названай тэрыторыі два маюць выразна немясцовае паходжанне. Гэта праваслаўны дваранін Леанід Напалеонавіч Дружылоўскі з Церскай вобласці і верагодны каталік Напалеон Іванавіч Янушкевіч з г. Тыфліса. Першы з'яўляўся альбо нашчадкам шляхецкага ўніяцкага роду Дружылоўскіх з Валынскай губерні[40], якія пасля скасавання уніі ў 1840-я гг. сталі праваслаўнымі, альбо перайшоўшым у праваслаўе прадстаўніком шляхецкага каталіцкага роду з Ковенскай губерні[41]. Другі, па ўсёй верагоднасці, таксама з'яўляўся выхадцам з губерняў Паўночна-Заходняга краю. Паводле прозвішчаў астатніх каўказскіх Напалеонаў, там дзе яны перададзеныя карэктна, можна меркаваць, што яны армянскага (*Аруцюнаў*, *Карапецьян*, *Хачатуранц*), альбо грузінскага (*Хвададзэ*, *Шаргадзэ, Начкебія*) паходжання.

Папулярнасць імя *Напалеон* сярод грузінаў можна патлумачыць тым, што гэта былі выхадцы з Кутаіскай губерні — земляў, якія з'яўляліся вотчынай знакамітага мегрэльскага княжацкага роду Дадзіяні, што, між іншым, былі ў сваяцтве з Банапартамі. Пасля таго як дачка ўладара Мегрэліі Саламея Дадзіяні ў 1868 г. выйшла замуж за прынца Ашыля (Ахіла) Мюрата (унука знакамітага напалеонаўскага маршала І.Мюрата і яго жонкі, сястры Напалеона Караліны), на землях Мегрэліі ўзрасла папулярнасць усяго, што было звязана з Банапартамі*. Дарэчы, сын Ашыля і Саламеі, якога таксама звалі Напалеон (1872—1943), быў афіцэрам расійскай арміі і ўдзельнікам Першай сусветнай вайны.

У традыцыі ж армянскай антрапаніміі ўвогуле была і ёсць распаўсюджаная з'ява даваць дзецям запазычаныя з іншых культур імёны знакамітых людзей. Так што сітуацыя з папулярнасцю імя *Напалеон* на Каўказе не нясе той прыхаванай антырасійскай накіраванасці, якая была ўласціва землям былой Рэчы Паспалітай.

Папулярнасць імя *Напалеон* на тэрыторыях былой Рэчы Паспалітай не мае патрэбы ў дадатковых тлумачэннях. Але лагічна было б меркаваць, што на тэрыторыі Царства Польскага і т. зв. Паўночна-Заходняга краю гэтая папулярнасць павінна быць прыблізна аднолькавай. Можна нават было б дапусціць, што на землях Царства Польскага, што раней уваходзілі ў склад Варшаўскага Герцагства, яна будзе вышэйшай. Аднак падлікі паказваюць, што ў другой

* На сённяшні дзень адна з трох вядомых пасмяротных масак Напалеона Банапарта захоўваецца менавіта ў былым палацы Дадзіяні ў грузінскім горадзе Зугдзідзі. Цікава, што з трох грузін-носьбітаў імя *Напалеон*, якія прадстаўленыя ў базе ўдзельнікаў Першай сусветнай вайны, двое паходзяць менавіта з Зугдідскага павета Кутаіскай губерні.

палове XIX ст. у т. зв. Паўночна-Заходнім краі гэтая папулярнасць была амаль у 6 разоў больш высокай, чым у Царстве Польскім. Гэта прытым, што ў Царстве Польскім пераважала рымска-каталіцкае насельніцтва, якое ў т. зв. Паўночна-Заходнім краі складала менш за палову*.

Гераічны "напалеонаўскі міф" на побытавым узроўні, відаць, пусціў глыбейшыя карані менавіта на землях былога ВКЛ. Бясспрэчнымі лідарамі па папулярнасці імя французскага імператара з'яўляюцца Ковенская, Віленская, Мінская і Віцебская губерні. Паколькі на гэтых тэрыторыях быў сканцэнтраваны аж 131 носьбіт імя *Напалеон*, паспрабуем падаць распаўсюджанасць гэтага імя на тэрыторыі пазначаных губерняў з раскладкай па паветах (дадамо сюды і рэшту губерняў т. зв. Паўночна-Заходняга краю — Гродзенскую і Магілёўскую).

Найбольшая колькасць носьбітаў імя *Напалеон* была сканцэнтраваная на тэрыторыі трох паветаў: Вількамірскага і Новааляксандраўскага Ковенскай губерні і Віленскага Віленскай губерні (агулам 50 асобаў). Побач — тэрыторыі са значнай, але нашмат меншай папулярнасцю: Ковенскі павет Ковенскай, Ашмянскі, Свянцянскі і Дзісенскі паветы Віленскай і Дрысенскі павет Віцебскай губерняў (агулам 23 асобы). Магчыма, такое размеркаванне папулярнасці імя ў другой палове XIX ст. мае прамую сувязь з тэатрам баявых дзеянняў у час вайны 1812 г. Менавіта на гэтых тэрыторыях адбыліся самыя значныя яе падзеі, звязаныя з асобай французскага імператара. Без сумнення, на гэтых тэрыторыях знаходзілася больш за ўсё памятных месцаў, звязаных з падзеямі мінулай вайны. Таксама выразна заўважная мяжа папулярнасці імя *Напалеон*, якая ішла ўздоўж лініі першага падзелу Рэчы Паспалітай 1772 г. Значна меншую ступень прафранцузскіх настрояў на тэрыторыі Віцебскай і Магілёўскай губерняў адзначае ў сваім найноўшым даследаванні украінскі гісторык В.Ададураў[42]. Выключэнне складаюць Дзвінскі, Дрысенскі і Люцынскі паветы, дзе ў другой палове XIX ст. імя французскага імператара сустракалася часцей. На нашу думку, гэтае выключэнне таксама напрамую звязана з падзеямі вайны 1812 г. — менавіта на тэрыторыі Дрысенскага павета каля вёскі Клясціцы 18—20 ліпеня (30 ліпеня — 2 жніўня) адбылася адна з першых буйных бітваў паміж французскімі і расійскімі войскамі. Рызыкнём выказаць меркаванне, што і легенды аб "напалеонаўскіх скарбах" мелі найбольшае распаўсюджанне менавіта на гэтых тэрыторыях. Усё гэта жывіла "напалеонаўскі міф" і прымушала духавенства і насельніцтва часцей спыняцца пры выбары імя для дзяцей на імя праслаўленага імператара.

Карткі ўдзельнікаў Першай сусветнай вайны — крыніца не надта дакладная, і нярэдка яны не ўтрымліваюць ўсёй паўнаты інфармацыі аб чалавеку. Так, не заўсёды маюцца звесткі аб веравызнанні, саслоўі і т.зв. "народнасці" *Напалеонаў* і *Напалеонавічаў*. Сярод тых, аб кім маюцца дакладныя дадзеныя, лічбы наступныя.

Веравызнанне: рыма-каталікі — 68; праваслаўныя — 6; лютэране — 3. Саслоўнае паходжанне: сяляне — 23; мяшчане — 4; дваране — 1. Прыналежнасць да "народнасцяў": палякі — 22; рускія — 3; літоўцы — 2; беларусы — 1; немцы — 1.

Як бачым, у другой палове XIX ст. імя *Напалеон* стала папулярным не толькі сярод шляхты, яно распаўсюдзілася на больш "нізкія" сацыяльныя групы — мяшчан і сялян. У абсалютнай большасці гэта былі асобы рымска-каталіцкага веравызнання, і найбольш тыя, хто лічыў сябе палякамі. У пытаннях вызначэння "народнасці" ў дадзеных картках трэба ставіцца вельмі асцярожна. Напрыклад, калі прозвішчы носьбітаў імя Напалеон мелі выразныя літоўскія карані альбо канчаткі, то складальнік дакумента лічыў за лепшае пакідаць у графе "народнасць" прочырк. Адзіны ў базе "беларус" Напалеон Іванавіч Вядзецкі паходзіў з Эржвілкаўскай воласці Расіенскага павета Ковенскай губерні на мяжы з Прусіяй і наўрад ці ў рэальнасці вызнаваў сябе беларусам.

Такім чынам, традыцыя надання імя ў гонар французскага імператара з'явілася на землях былога Вялікага Княства Літоўскага адразу пасля каранацыі Напалеона Банапарта ў 1804 г. Для мясцовага насельніцтва гэта быў эфектны і, галоўнае, легальны спосаб дэкларацыі сваіх палітычных перакананняў, выказвання патрыятычных пачуццяў і антырасійскіх настрояў.

Наданне імя *Напалеон* у першыя дзесяцігоддзі яго распаўсюджання было свядомым выбарам бацькоў дзіцяці, а таксама святароў, якія яго хрысцілі. Факт выбару імя ў выпадку з *Напалеонам* не меў прывязкі да царкоўнага календара, як гэта было з іншымі імямі. Хоць свята ў гонар Св. Напалеона афіцыйна адзначалася 15 жніўня, хрысцілі дзяцей такім імям у любы час года. Рост папулярнасці імя залежаў ад палітычных падзей у Еўропе, асабліва тых, якія мелі непасрэднае дачыненне да земляў былой Рэчы Паспалітай: заключэнне Тыльзіцкага міру паміж Францыяй і Расіяй у 1807 г., расійская кампанія Напалеона ў 1812 г., задушэнне паўстання 1830—1831 гг. Падпісанне Тыльзіцкага міру спарадзіла папулярнасць цікавага падвойнага імя — *Напалеон-Аляксандр*.

Першапачатковая мода на імя *Напалеон* бытавала ў шляхецкім асяроддзі, але да сярэдзіны XIX ст. яна распаўсюдзілася на ўсе саслоўі. Найбольш папулярным імя было сярод рымска-каталіцкага насельніцт-

* Паводле перапісу 1897 г., насельніцтва Царства Польскага складала 9,4 мільёна чалавек, насельніцтва т. зв. Паўночна-Заходняга краю — 10,6 мільёна чалавек (Віленская губ. — 1,59 мільёна, Віцебская губ. — 1,49 мільёна, Гродзенская губ. — 1,63 мільёна, Ковенская губ. — 1,64 мільёна, Магілёўская губ. — 1,69 мільёна, Мінская губ. — 2,54 мільёна). Лічбы, як бачым, супастаўныя.

ва, але нярэдка траплялася і сярод грэка-каталікоў (уніятаў). У маштабах Расійскай Імперыі імя *Напалеон* можна было сустрэць амаль выключна ў сем'ях выхадцаў з зямель былой Рэчы Паспалітай, нават калі яны жылі на тэрыторыі Маскоўскай, Томскай альбо Сахалінскай губерняў. Выключэнне складалі асобныя рэгіёны Каўказскага намесніцтва — мегрэльскія землі з папулярнасцю Банапартаў дзякуючы сваяцтву з мясцовай дынастыяй Дадзіяні і тэрыторыі, заселеныя армянамі з іх традыцыяй даваць імёны дзецям у гонар знакамітых людзей любых культур і паходжання.

У губернях т. зв. Паўночна-Заходняга краю, якія раней уваходзілі ў склад Вялікага Княства Літоўскага, папулярнасць імя *Напалеон* была ў 6 разоў вышэйшай, чым у губернях Царства Польскага, якія раней уваходзілі ў склад Польскага Каралеўства. Магчыма, гэта было звязана з большым расчараваннем на польскіх землях палітыкай Францыі на працягу XIX ст. Таксама вельмі верагодна, што гераічны "напалеонаўскі міф" пусціў глыбейшыя карані менавіта на землях ВКЛ і найперш у тых мясцовасцях, якія імператар наведаў асабіста падчас кампаніі 1812 г. У адрозненне ад польскіх земляў, тут даўжэй чакалі Напалеона ў ролі збавіцеля. Усе падзеі, звязаныя з яго кароткім і імклівым знаходжаннем на землях былога ВКЛ, спарадзілі безліч легендаў, якія сілкавалі "напалеонаўскі міф" і спрыялі папулярнасці яго імя.

[1] Марозаў С.П. Дзяржаўная традыцыя Вялікага Княства Літоўскага ў палітычнай свядомасці першых пакаленняў яго нашчадкаў: погляд з Беларусі, Расіі, Францыі (1811—1832) // Архіварыус. Вып. 12. Мінск, 2014. С. 171.

[2] Łyszczyna J. "Bóg jest z Napoleonem, Napoleon jest z nami!". Mit Napoleona w literaturze polskiej XIX wieku. Katowice, 2009.

[3] Матвейчык Д.Ч. Выгнаныя з роднага краю: Паслялістападаўская эміграцыя з Беларусі і Літвы (1830—1870-я гады). Мінск, 2011. С. 27—38.

[4] Geneanet. Электронны рэсурс. Рэжым доступу: https://en.geneanet.org/. Дата доступу: 01.06.2019.

[5] Décret imperial concernant la fête de Saint Napoléon et celle du rét ablissement de la religion catholique en France // Gallica / Bibliothèque nationale de France, département Estampes et photographie, Réserve QB-370 (61)-FT 4. Электронны рэсурс. Рэжым доступу: https://gallica.bnf.fr/ark:/12148/btv1b6941038q. Дата доступу: 01.06.2019.

[6] Ададуров В. Война цивилизаций: Социокультурная история русского похода Наполеона. Т. 1: Религия — Язык. Киев, 2017. С. 131—141.

[7] Kaźmierczak A. Kamieński Napoleon Ludwik Felicjan // Polski słownik biograficzny. T. XI. Wrocław—Warszawa—Kraków, 1964—1965. S. 547—548.

[8] Гербоўнік беларускай шляхты (далей — ГБШ). Т. 1. А. Мінск, 2002; ГБШ. Т. 2. Б. Мінск, 2007; ГБШ. Т. 3. В. Мінск, 2014; ГБШ. Т. 4. Г. Мінск, 2016; ГБШ. Т. 5. Д. Мінск, 2018.

[9] Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей — НГАБ). Ф. 937, воп. 4, спр. 177, арк. 9 адв.

[10] ГБШ. Т. 4. Г. С. 582.

[11] НГАБ. Ф. 319, воп. 2, спр. 3866, арк. 16 — 17 адв.

[12] НГАБ. Ф. 826, воп. 1, спр. 1.

[13] НГАБ. Ф. 333, воп. 9, спр. 8.

[14] НГАБ. Ф. 937, воп. 4, спр. 70, арк. 9.

[15] Lietuvos Valstybės Istorijos Archyvas (далей — LVIA). F. 604, ap. 10, b. 223, l. 45 a.

[16] Там жа. L. 208 a.

[17] Там жа. L. 221.

[18] НГАБ. Ф. 741, воп. 1, спр. 16, арк. 60, 63 адв., 64.

[19] Часовая мінская газета. 1812 год: перакл. з польск. мовы / Пад. рэд. канд. гіст. навук Я.Анішчанкі. Мінск, 2008. С. 13.

[20] НГАБ. Ф. 592, воп. 2, спр. 19, арк. 132 адв.

[21] Наполеон Бонапарт: pro et contra (Образ Наполеона Бонапарта в культурной памяти об Отечественной войне 1812 года), антология. Санкт-Петербург, 2012. С. 145—147.

[22] Лісейчыкаў Д.В. Святар у беларускім соцыуме: прасапаграфія ўніяцкага духавенства 1596—1839 гг. Мінск, 2015.

[23] Там жа. С. 27.

[24] НГАБ. Ф. 136, воп. 13, спр. 866, арк. 124.

[25] НГАБ. Ф. 937, воп. 4, спр. 177, арк. 17.

[26] Там жа. Спр. 137, арк. 45 адв. — 46.

[27] НГАБ. Ф. 319, воп. 2, спр. 3420, арк. 1 — 5 адв.

[28] НГАБ. Ф. 937, воп. 4, спр. 177, арк.10 адв.

[29] ГБШ. Т. 1—5.

[30] LVIA. F. 604, ap. 10, b. 223, l. 76.

[31] Там жа. L. 76, 130, 214.

[32] НГАБ. Ф. 741, воп. 1, спр. 16, арк. 60.

[33] НГАБ. Ф. 319, воп. 2, спр. 1141.

[34] Там жа. Спр. 1168, арк. 29.

[35] НГАБ. Ф. 319, воп. 1, спр. 82, арк. 876.

[36] Там жа. Воп. 2, спр. 1168, арк. 97.

[37] ГБШ. Т. 1. А. С. 80; Лісейчыкаў Д.В. Святар у беларускім соцыуме: прасапаграфія ўніяцкага духавенства 1596—1839 гг. С. 27.

[38] Первая мировая война 1914—1918: информационный портал. Электронны рэсурс. Рэжым доступу: https://gwar.mil.ru/. Дата доступу: 01.06.2019.

[39] Там жа.

[40] Российский государственный исторический архив (далей — РГИА). Ф. 1343, оп. 20, д. 3393, 3394.

[41] Там жа. Д. 3395.

[42] Ададуров В. Отношения между Великой армией и дворянским сословием в западных губерниях Российской империи в 1812 г. [У друку.]

***Аўтар выказвае шчырую падзяку Вадзіму Ададураву, Яўгену Глінскаму, Кшыштафу Касаржэцкаму, Дзмітрыю Матвейчыку, Марыне Скіданавай, Юрыю Снапкоўскаму і Анатолю Сцебураку за дапамогу ў працы над артыкулам.***

# *«З Напалеонам Бог, а Напалеон з намі!»: папулярнасць імя французскага імператара на землях былога Вялікага Княства Літоўскага ў XIX стагоддзі*

*(да матэрыялу Дзяніса Лісейчыкава)*






DÉCRET
IMPÉRIAL
CONCERNANT
LA FÊTE DE SAINT NAPOLEON
ET CELLE DU RÉTABLISSEMENT DE LA RELIGION CATHOLIQUE EN FRANCE.

Au Palais des Tuileries, le 19 Février 1806.

*Дэкрэт імператара Напалеона I аб свяце ў гонар святога Напалеона і ўзнаўленні каталіцкай рэлігіі ў Францыі.*
19 лютага 1806 г.




*Надмагілле Станіслава Камінскага на могілках Навагрудка (фота аўтара, чэрвень 2019). Надпіс на пліце: «Tu leży Stanisław Kaminski. Umarł w roku 1838 augusta 3 dnia, mający wieku lat 67. Ktory prosi o troie anielskie pozdrowienie».*